ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар дзяржаўнай установы адукацыі "Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі"
В.Л.Акуленка
20.03.2017

Заданні другога этапу абласной алімпіяды вучняў IV-IX класаў
па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"
(літаратурнае чытанне)
2016/2017 навучальны год
IV клас

**Заданне 1. Выпішыце словы, у якіх літары *дз* і *дж* абазначаюць два гукі.**

Дзядуля, падзівіцца, падземны, подзвіг, аджыць, адзенне, вадзіца, аб'езд, адзімаваць, паджарысты.

**Заданне 2. Словы, якія характарызуюць людзей са станоўчага боку, запішыце ў першы слупок, а якія з адмоўнага – у другі.**

Гультай, працаўнік, няўмека, дабрак, малайчына, разявака.

**Заданне 3. Перакладзіце імёны на беларускую мову, запішыце іх у алфавітным парадку.**

Маргарита, Ирина, Вячеслав, Марина, Анжела, Борис, Юрий, Григорий.

**Заданне 4. Устаўце словы, як патрабуе сэнс. Спішыце і абазначце суфіксы ў дапісаных словах.**

Пчол даглядае … .
Цэглу кладзе … .
Пажар тушыць … .
Сцены фарбуе … .
Карціну піша … .
Самалётам кіруе … .

**Заданне 5. Спішыце сказ, абазначце часціні мовы.**

Горкі фініш у Рыгоркі: нос разбіў, як ехаў з горкі.

**Заданне 6. Замяніце ўстойлівыя словазлучэнні адным словам і запішыце іх.**

Стаяць над душой – … ;
трымаць язык за зубамі – … ;
на ўсю моц – … ;
рукой падаць – … ;
як мокрае гарыць – … ;
у адзін голас – … ;
як курыца лапай – … ;
за трыдзевяць зямель – … ;
за дзедам шведам – … ;
як гром з яснага неба – … .

**Заданне 7. Выпішыце парамі праз коску імёны і прозішчы беларускіх пісьменнікаў.**

***Імёны:*** Якуб, Ніл, Кандрат, Уладзімір, Янка, Эдзі, Пятрусь, Максім, Васіль, Анатоль.

***Прозішчы:*** Гілевіч, Клышка, Агняцвет, Купала, Броўка, Крапіва, Танк, Караткевіч, Вітка, Колас.